# Слова да беларускага чытача

Гэтая кніжка пісалася намі на пачатку новага тысячагодзьдзя, а ўпершыню выдадзеная па–польску была ў 2002 г. Прызначалася яна перадусім для польскага чытача, ці беларускага, але з Польшчы. Менавіта дзеля гэтага даволі шмат увагі мы прысьвяцілі падзеям на даўнім Падляшшы і больш позьняй Беласточчыне, якая зьявілася пад канец XVIII ст., разам з падзеламі Рэчы Паспалітай, сьпярша як прускі дэпартамэнт, а пасьля як расейская вобласьць. Гэта — малая бацькаўшчына аўтараў, якія абодва беларусы.

Нягледзячы на прывязанасьць да малой бацькаўшчыны, асноўную ўвагу мы прысьвяцілі нашай Вялікай Бацькаўшчыне — Беларусі. Яна ў нас большая за Рэспубліку Беларусь, бо нават у мадэрны час Беларусьсю былі тэрыторыі, якія пасьля воляй лёсу апынуліся па–за межамі Краю. Даволі прыгадаць, што сёньняшняя Рэспубліка Беларусь апэлюе да традыцыі БССР, абвешчанай першы раз у Смаленску.

Ва ўступе мы напісалі, што будзем адстойваць перш за ўсё беларускі, а ня польскі пункт гледжаньня на гістарычныя падзеі, але без празьмернага шанаваньня беларускіх гістарычных мітаў. Аўтар рэцэнзіі на гэтую кніжку, Захар Шыбека[1], палічыў нават, што мы — разбуральнікі нацыянальных мітаў, сам пры гэтым вызначаючыся як прыхільнік рамантычных адносінаў да мінулага.

Нам здаецца, што розьніца тут не прынцыповая. Мы калісьці вельмі рамантычна ставіліся ня толькі да гісторыі, але і да сучаснасьці, шмат энэргіі прысьвяцілі “хаджэньню ў народ” і буджэньню яго да самастойнага існаваньня. Я. Мірановіч быў першым незалежным беларускім кандыдатам у польскі Сойм, а А. Латышонак — лідэрам Беларускага дэмакратычнага аб’яднаньня, адзінай на той час партыі нацыянальнай меншасьці ў Польшчы. Гэтая дзейнасьць якраз і вылечыла нас ад рамантычнага погляду на свой народ і ягоную гісторыю. Мы разумеем, сьледам за вялікім польскім гісторыкам Юзафам Шуйскім, што “фальшывая гісторыя — гэта настаўніца фальшывай палітыкі”. Ці ж трэба для гэтага лепшы доказ, чым параза Беларускага Народнага Фронту “Адраджэньне”, які ў свой час паблытаў Беларусь зь Вялікім Княствам Літоўскім? Дарэчы, рэальнасьць пачатку новага тысячагодзьдзя аказалася для нас яшчэ менш рамантычнай, чым можна было спадзявацца. Пішам пра гэта ў частцы, дададанай цяпер да асноўнага тэксту кніжкі.

Мы ўдзячныя З. Шыбеку за заўважаныя ім памылкі, выпраўленыя ў гэтым тэксьце. Прызнаем таксама, што словы *“гісторыя Беларусі зь сярэдзіны XVIII ст. да канца XX ст. — гэта гісторыя цывілізацыйнага адасабленьня ад Польшчы гэтай краіны і яе сучаснай нацыі, якая толькі фармавалася”* — выраз недакладны, калі можна яго зразумець так, як зразумеў гэта аўтар рэцэнзіі — што ўзьнікненьне сучаснай беларускай нацыі непасрэдна зьвязанае з аддаленьнем ад Польшчы. Мы толькі зафіксавалі факт, што аддаленьне ад Польшчы, зробленае пад ціскам Расеі, адбывалася ў той самы час, калі фармавалася сучасная беларуская нацыя. Мадэрная беларуская нацыя ўзьнікла на мяжы XIX і XX ст. як эўрапейская нацыя свабодных вытворцаў — сялян, у чым падобная была да мадэрнай польскай нацыі, у апошняй толькі больш было сярэдніх і вышэйшых пластоў грамадзтва. На жаль, на мяжы XX і XXI ст. Беларусь надалей аддалялася ад Польшчы. Краявід Беларусі, краіны вялізных гарадоў і аграгарадкоў, нічым не нагадвае Польшчы, дзе гараджане перасяляюцца ў мястэчкі і вёскі, а сяляне захоўваюць прыватныя гаспа-

---

[1] Шыбека З. Łatyszonek, Oleg; Mironowicz, Eugeniusz. Historia Białorusi od połowy XVIII do końca XX wieku. Białystok, 2002 // Беларускі гістарычны агляд. 2002. Т. 9. Сш. 1—2 (16—17). С. 195—201.

даркі. Беларусь і Польшча цяпер — краіны іншых цывілізацыяў, Эўропы і Эўразіі, нягледзячы на вартыя ўхваленьня намаганьні вярнуць эўрапэйскі выгляд цэнтрам беларускіх гарадоў.

Мы таксама схіляемся да погляду З. Шыбекі, што назва "III Рэч Паспалітая" ў дачыненьні да сучаснай Польшчы зь беларускага пункту гледжаньня непрымальная, паколькі такім чынам ускосна прызнаецца польскай дзяржавай і I Рэч Паспалітая. Таму па–беларуску будзем яе называць у духу францускага арыгіналу гэткага спосабу адлічваньня дзяржаваўтварэньняў "III Рэспублікай".

Кніжка пісалася згодна з зацьверджанай польскім Міністэрствам нацыянальнай адукацыі праграмай вывучэньня беларускай і рэгіянальнай тэматыкі ў якасьці дадатку да праграмы вывучэньня гісторыі ў пачатковых і сярэдніх школах у былым Беластоцкім ваяводзтве, распрацаванай Яўгенам Вапам, і прызначаная была перш за ўсё настаўнікам. Асобна выйшаў у сьвет падручнік Я. Мірановіча для агульнаадукацыйных ліцэяў[2]. Ад той пары ўся школьная сыстэма, для якой была распрацаваная гэта праграма, стала былой (як, дарэчы, і само Беластоцкае ваяводзтва). Вывучэньне як беларускай, так і рэгіянальнай гісторыі не было ўведзена ў праграму, таму выпускнікі падляскіх школаў ведаюць сёе–тое (кожны год усё менш) пра тое, што адбывалася ў Кракаве ці ў Варшаве, і нічога ня толькі пра гісторыю Беларусі, але і пра мінулае Беластоку з навакольлем.

Маем надзею, што беларускаму чытачу будзе цікава даведацца, якая была гэтая гісторыя, убачаная вачыма беларускіх гісторыкаў зь Беластоку.

*Беласток, 1 жніўня 2009 году*

[2] Mironowicz E. Historia Białorusi. Białystok, 2001.